# РОЛЯ БЕЛАРУСІ ВА ЎРЭГУЛЯВАННІ КАНФЛІКТУ НА ПАЎДНЁВЫМ УСХОДЗЕ УКРАІНЫ (2015–2019)

**Г. Я. Салаўёў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*h.salaujeu@gmail.com;*
*навук. кір. – У. Е. Снапкоўскі, д-р гист. навук, праф.*

Артыкул апісвае ролю Рэспублікі Беларусь ва ўрэгуляванні ўкраінскага крызіса ў перыяд пасля сустрэчы нармандскай чацвёркі ў Мінску 11-12 лютага 2015 г. да выбрання У. Зяленскага прэзідэнтам Украіны. Разглядаюцца мірныя ініцыятывы Беларусі, накіраваныя на ўрэгуляванне канфлікта на паўднёвым усходзе Украіны. Асвятляецца рэакцыя Украіны, Расіі, заходніх дзяржаў (ЕС і ЗША) на беларускія прапановы.

***Ключавыя словы:*** Беларусь; Украіна; Мінскі працэс; расійска-ўкраінскі канфлікт; А. Лукашэнка.

У 2015–2019 гг. Мінск з’яўляўся пляцоўкай для мірных трохбаковых перагавораў па ўрэгуляванню канфлікта на паўднёвым усходзе Украіны. Фактарамі, якія спрыялі выкананню пасрэдніцкай місіі Беларусі, з’яўляліся згода Масквы і Кіева весці перагаворы ў Мінску, прызнанне пасрэдніцкай ролі Беларусі іншымі дзяржавамі, нейтральная пазіцыя Мінска ў расійска-ўкраінскім канфлікце, паступальны працэс нармалізацыі адносін з Захадам, адмова Мінска ад удзелу ў інфармацыйнай вайне супраць Украіны. Сярод фактараў, якія заміналі развіццю Мінскага працэсу, можна назваць адсутнасць фармальна нейтральнага статуса Беларусі, яе блізкія, саюзніцкія адносіны з Расіяй, рэпутацыя закрытай краіны са складанымі адносінамі з Захадам.

Украінскія палітыкі выказвалі свае сімпатыі да Беларусі і яе праеўрапейскага выбару. 8 чэрвеня 2015 г. у ходзе пасяджэння міжпарламенцкага савета «Украіна-НАТО» украінскі міністр замежных спраў П. Клімкін заявіў, што Беларусь мае еўрапейскую будучыню. На яе карысць выказваўся і прэм’ер-міністр А. Яцэнюк: «Для сусветнай супольнасці, для Еўрапейскага саюза, для ўсіх нас вельмі важна ні ў якім разе не адхіліць і не ізаляваць Беларусь».

У разглядаемы перыяд Беларусь прыняла вялікую колькасць бежанцаў з рэгіёну Данбаса, што стала для краіны адным з выклікаў сацыяльна-эканамічнага характару. 27 верасня 2016 г., У. Макей адзначыў, што за ўвесь перыяд Беларусь прыняла 160 тыс. украінскіх вымушаных мігрантаў і, згодна з указам Прэзідэнта №420 ад 30 жніўня 2014 г., ім былі прадстаўлены спецыяльныя прэферэнцыі. Аднак нягледзячы на руку дапамогі, Старшыня Савета Рэспублікі М.

Мяснікові заяўляў пра магутны ціск украінцаў на беларускі рынак працы [6, с. 108].

5 жніўня 2015 г., у інтэрв'ю недзяржаўным СМІ, А. Лукашэнка падкрэсліў, што Данбас абавязкова будзе ўкраінскім, але вяртанне Крыма амаль немагчыма, і запэўніў Кіеў, што з Беларусі не будзе ажыццяўляцца ніякай пагрозы і інтэрвенцыі на тэрыторыю Украіны. Прэзідэнт заклікаў Крэмль пашырыць міжнародную кантактную групу, дадаўшы амерыканскіх партнёраў. Пазней у кастрычніку ў выступленні перад камандным саставам Узброеных сіл Беларусі Лукашэнка заявіў пра важнасць захавання выпрацаванага на палітыка-дыпламатычным узроўні баланса адносінаў з Масквою і Кіевам, каб ні ў якім разе не быць уцягнутымі ў іх супрацьстаянне, падкрэсліўшы, што канфлікт з'яўляецца міждзяржаўным, а не ўнутрыўкраінскім. Расія на афіцыйным узроўні не згодна з такой трактоўкай і выступае супраць уцягвання новых бакоў у перагаворы, асабліва амерыканскага [3].

Ва ўмовах нарастаючага ўкраінска-расійскага крызісу Беларусь прымала захады, каб, як не дапусціць больш глыбокага супрацьстаяння паміж Кіевам і Масквой, так і зарабіць эканамічныя дывідэнды з цякучага крызісу. У прыватнасці, яна прапанавала мінскі міжнародны аэрапорт у якасці «транзітнага калідора» для аднаўлення зручных авіязносін паміж Украінай і Расіяй. Да таго ж рэспубліка займалася рээкспартам украінскай прадукцыі ў Расію, дзе яна была афіцыйна забаронена. Апроч гэтага яна адмовілася падтрымаць Маскву ў пытанні выхада з зоны свабоднага гандлю з Украінай, якая дзейнічае ў рамках СНД [4, с. 20].

25-26 жніўня 2016 г. адбыўся візіт У. Макея ў Кіеў, дзе ён заявіў, што паміж Беларуссю і Украінай існуе «сталае партнёрства» і няма «ніякіх нявырашаных праблем». Пад час візіту ён адзначыў, што Мінск не разглядае размяшчэнне дадатковых кантынгентаў НАТО ля сваіх межаў як прамую пагрозу ваеннай бяспецы і раскрытыкаваў Расію за правядзенне вайсковых вучэнняў на мяжы з Беларуссю і Украінай, на якія не былі запрошаны міжнародныя назіральнікі. Такія выказванні былі пазітыўна ацэнены ўкраінскімі афіцыйнымі асобамі [1, с. 102].

Але нягледзячы на вялікую колькасць станоўчых фактараў, ва Украіне шэраг палітыкаў сумняваўся ў сапраўды нейтральным статусе Беларусі і ставіў пытанне аб пераносе перагаворнай пляцоўкі ў іншую краіну. Яны спасылаліся на галасаванне Беларусі супраць украінскіх рэзалюцый па Крыму ў ААН, правядзенне стратэгічных вайсковых расійска-беларускіх вучэнняў «Захад-2017», шпіёнскі скандал і справу П. Шаройкі, выкраданне ўкраінскага грамадзяніна П. Грыба на тэрыторыі Беларусі з

наступнай перадачай яго расійскім спецслужбам і іншыя антыўкраінскія на іх думку дзеянні беларускіх улад [2, с. 94–95].

Міжнародны розглас пытанне аб пераносе перагавораў з Мінска набыло ў 2018 г. пад час візіту прэзідэнта Казахстана Н. Назарбаева ў ЗША, дзе ён нагадаў, што менавіта Казахстан павінен быў прымаць перагаворы па ўрэгуляванні канфлікта на Данбасе. З ім пагадзіўся прэзідэнт ЗША Д. Трамп, які прапанаваў пашукаць альтэрнатыўнае месца сталіцы Беларусі. Аднак шэраг афіцыйных асобаў, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў Мінскім працэсе, выказаліся ў падтрымку Мінска. Спецпрадстаўнік АБСЕ ва Украіне М. Сайдзік на сустрэчы з Лукашэнкам падкрэсліў: «Мінск як месца сустрэчы – гэта тое, што нам зараз патрэбна, хоць гэты канфлікт доўжыцца ўжо вельмі доўга». У. Макей заявіў, што Беларусь не прасілася стаць пляцоўкай для перагавораў, а адгукнулася на просьбу ўдзельнікаў нармандскай чацвёркі: «У адрозненні ад іншых Беларусь за лаўрамі міратворцы не гоніцца. Але гэта канфлікт у нашым рэгіёне, і мы кроўна зацікаўлены ў яго вырашэнні». Яго ўкраінскі калега П. Клімкін адзначыў, што месца перагавораў не мае асаблівага значэння, а Мінск – зручная пляцоўка для кантактнай групы, Беларусь нейтральная, а лагістыка камфортная.

18 лютага 2018 г. А. Лукашэнка агучыў ідэю даслаць кантынгент беларускіх міратворцаў на Данбас. Масква лічыла, што міратворчая місія павінна быць разгорнута выключна на працягу лініі размежавання бакоў у канфліктнай зоне, у той час калі Кіеў жадаў бачыць місію на ўсёй лініі расійска-ўкраінскай мяжы. Але як Масква, так і Кіеў з вялікай асцярогаю паставіліся да ідэі кантынгента беларускіх міратворцаў: украінцы баяцца шчыльных повязяў беларусаў з расійскімі вайскоўцамі, а Расія не хоча ўмяшання Беларусі ў «грамадзянскую вайну» ва Украіне, што пагражае рэалізацыі яе стратэгічных планаў па замарожванні канфлікту з Украінай на доўгія часы.

На мінскай сустрэчы Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы 30 кастрычніка 2018 г. А. Лукашэнка сфармуляваў свой план па ўрэгуляванні канфлікта: працягнуць работу па ўмацаванні магчымасцяў Спецыяльнай маніторынгавай місіі АБСЕ, знайсці прымальны для ўсіх варыянт размяшчэння на Данбасе міратворчых сіл, паэтапнае разварочванне місіі, актывізацыя нармандскага фармата і далучэнне да яго прадстаўнікоў ЗША, узяццё кантроля на расійска-ўкраінскай мяжы Беларуссю і правядзенне выбараў на Данбасе пры ўдзеле беларускіх прадстаўнікоў. План беларускага Прэзідэнта не атрымаў падтрымкі з боку расійскіх і ўкраінскіх партнёраў, але прывабіў заходніх палітыкаў і экспертаў [5, с. 4].

Перагаворная пляцоўка ў Мінску – гэты безумоўны поспех беларускай дыпламатыі. Дзякуючы мірнаму працэсу Беларусь умацавала ўласную бяспеку і свой аўтарытэт на міжнароднай арэне, атрымаўшы званне донара стабільнасці рэгіёна, палепшыла свой знешнепалітычны імідж, запрасіўшы ў сталіцу лідараў флагманскіх еўрапейскіх дзяржаў. У разглядаемы перыяд Прэзідэнт А. Лукашэнка, міністр У. Макей, беларускія паслы ў Кіеве В. Вялічка (да 2018 г.) і І. Сокал працягвалі дэклараваць падтрымку тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны, заяўляючы, што Беларусь ніколі не стане плацдармам вайсковай пагрозы для Украіны. Мінск адмовіўся ад размяшчэння расійскай авіябазы на тэрыторыі рэспублікі і спакойна паставіўся да супрацоўніцтва Украіны з НАТО. У параўнанні з баявымі падзеямі на паўднёвым усходзе Украіны ў 2014 г. інтэнсіўнасць вайсковых дзеянняў у 2015-2019 гг., дзякуючы ролі Беларусі, істотна знізілася.

Нягледзячы на нежаданне Аляксандра Лукашэнкі раздражняць Маскву, ён працягваў паглыбляць канструктыўныя адносіны з Кіевам, у т. л. для нармалізацыі адносінаў з ЕС і ЗША. Пазіцыя Мінска па ўкраінскім крызісе прывяла да спынення санкцый з боку Заходніх краін. Нацыянальным інтарэсам Мінска ва ўмацаванні добрых адносінаў з Кіевам можа служыць вялікі тавараабарот: Украіна займае другое пасля РФ месца па аб'ёме тавараабарота і экспарту, і ў гандлі з Украінай Беларусь захоўвае станоўчае сальда. Беларусь асцерагалася як не згубіць такога моцнага гандлёвага партнёра, так і не адштурхнуць ад сябе краіны ЕС, на якія прыходзіцца таксама вялікая доля экспарту. У адваротным выпадку гэта магло б прывезці да ізаляцыі краіны і ўмацавання залежнасці ад Расіі.

**Библиографические ссылки**


1. Богуцкий, О. Беларусь – Украина: Эпоха «зрелого партнерства» / Олег Богуцкий // Белорусский ежегодник. – Вильнюс: Логвінаў, 2017. – С. 101-109.
2. Максак, Г. Беларусь – Украина: от привилегированного партнерства к «гибридному» / Г. Максак // Белорусский ежегодник. – Вильнюс: Логвінаў, 2018. – С. 88-95.
3. Интернет-адрес: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/operativnyj-sbora-komandnogo-sostava-vooruzhennyx-sil-12462/.
4. *Отношения стран СНГ и Грузии с Украиной в контексте украинского кризиса* : доклады РИСИ / Проблемы национальной стратегии. – 2017. – №1 (40). – С. 13-59.
5. *Прейгерман, Е.* Минский Мюнхен: констатация большой региональной проблемы / Е. Прейгерман // EaP Think Bridge : Совет внеш. пол. «Украинская призма» ; гл. ред.: Ольга Чижова. – Киев, 2018. – №6 (16). – С. 22-25.

6.7. *Шаншиева, Л. Н.* Беларусь и украинский кризис: двойственность оценок и поиски решений / Л. Шаншиева // Россия и современный мир. – 2015. – №3 (88). – С. 96-112.